**ПО́ЛАЦКІ КУРГА́ННЫ НЕКРО́ПАЛЬ 9–10 ст.** «Паўночны курганны могільнік» размяшчаўся на правабярэжжы р. Палата, цягнуўся з ПнУ уздоўж правага берага Палаты ад *Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра* на ПдЗ і набліжаўся да выгіну старога рэчышча. Адзіная крыніца, якая пацвярджае яго існаванне, – план С.Пахалавіцкага 1579. Канчаткова разбураны ў 1916 пад час будаўніцтва ваеннага аэрадрома.

«Усходні курганны могільнік» размяшчаўся ўздоўж правага берага р. Зах. Дзвіна. Акрамя плана Пахалавіцкага звесткі аб існаванні тут «курганоў» змяшчаюць Лебедзеўскі летапіс, рэвізія Полацкага пав. 1563 і магістрацкія кнігі 17–18 ст., дзе помнікі згадваюцца пад назвай «валатоўкі». Адзначаны на планах 1707 і 1720-х г. Паступовае разбурэнне засведчана ў актавых кнігах полацкага магістрата пад 1739 (упамінаецца «капаная» валатоўка). Праіснавалі да к. 18 ст. Рэшткі пахавальнага інвентару даследавалі ў 1959 Л.Д.Победь (жал. меч), у 2005 А.А.Салаўёў (пахавальны керамічны посуд). Насыпы «ўсходняга курганнага могільніка» пачыналіся ў раёне паркана 16 ст. і цягнуліся не менш як на 1500 м на У ад Верхняга замка. На сучаснай карце Полацка гэта адпавядае прасторы паміж вуліцамі Свярдлова, Ніжнепакроўская, Камуністычная і Юбілейная. Пахаванні належаць крывіцка-скандынаўскаму (дружыннаму) насельніцтву.

*Дз.У.Дук, М.А.Плавінскі.*